# Новыя выставы ў Галерэі “Універсітэт культуры”: Двое з дзясятка лепшых

**Напрыканцы мінулага тыдня ў мастацкай галерэі “Універсітэт культуры”, выставачнай палітыкай якой з’яўляецца прасоўванне маладых і адносна маладых творцаў (пажадана гадаванцаў Універсітэта) адбылося два вернісажы. Малавядомымі іх герояў назваць цяжка, аднак, можна сцвярджаць: іх кар’еры знаходзяцца ў пачатку, і пачатак у абодвух паспяховы.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



12 лютага сваю калекцыю прац пад назваю “XL” прэзентаваў скульптар Сяргей Аганаў. Дарма шукаць у двух адведзеных аўтару залах галерэі працы вялікага, як можа падацца з назвы экспазіцыі, памеру: прадстаўлена малая станкавая скульптура, а абрэвіятура адносіцца да ўзросту мастака. Гэта рымская лічба 40, што адпавядае першаму “сурёзнаму” юбілею, які адзначае Сяргей Аганаў: веку для творчых прафесій яшчэ умоўна маладому, але дастатковаму для падсумавання першых кар’ерных вынікаў.

Скульптару пашанцавала зрабіцца шырока вядомым за кошт “эфекта Жбанава” — адна з яго работ выйшла на прасторы мінскіх плошчаў і з 2014 г. заняла пачэснае месца побач з Ратушай.



*Сяргей Аганаў. Падарожжа*

Гэта вядомы ўсім мінчукам “Войт”, фігура якога ўзвышаецца над планам старога Мінска. Адзначым, што гістарычная, як і міфалагічная, а праз яе звязаная з пошукам вобразных першаўзораў-архетыпаў, тэматыка для Аганава блізкая, што ўбачаць і наведвальнікі выставы. Больш за тое, увасабляючы яе пераважна ў станкавай пластыцы — добра прыдатнай для выставачных залаў, Аганаў абірае для яе адпаведную выразную форму. “М*ае інспірацыі — раманска-гатычная скульптура, перакладаю яе на сучасную мову*,” — кажа мастак, і яго словы выглядаюць ключом для разумення яго сённяшняга пластычнага стылю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Другая экспазіцыя, якая адчынілася ў музеі 13 лютага, прадстаўляе незвычайныя творы мастацкага тэкстылю, вырабленыя выпускніцай, а сёння выкладчыцай Універсітэта Марыяй Барысенка. Своеасаблівасць экспанатаў выяўляецца ўжо ў музычнай назве калекцыі, — “BLUES”, хаця абазнаныя аматары сучаснага беларускага мастацкага працэсу адразу прыгадаюць два папярэднія праекты Марыі — “JAZZ” і “BEATLES forever!”, і не здзівяцца чарговай музычнай ноце ў яе творчасці. Па-другое, большасць экспанаваных работ можна аднесці да своеасаблівага тыпу “аб’ёмнага тэкстылю”.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ



Рознафактурныя, шматколерныя і цікава падсветленыя кампазіцыі на выставе зусім не 100-адсоткава прывязаныя да сцяны, як звычайныя габелены, і прастора, відавочна, абраная для іх як чарговае актыўнае вымярэнне. Гэты канцэптуальны крок нядаўна спрапагандавала на адпаведнай выставе “аб’ёмнага тэкстылю” (ІІІ Рэспубліканскім пленэры тэкстыльнай скульптуры “Снежнае лета” 28 ліпеня — 01 жніўня.2014 года) знаная мінская экспазіцыянерка Ларыса Фінкельштэйн, і як бачым, ініцыятыва знайшла працяг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Марыя Барысенка*

Безумоўна, варта было прысутнічаць на адкрыцці экспазіцыі 13 лютага, дзе незвычайна шматлікую публіку вітаў блюзавымі кампазіцыямі гурт Юрыя Несцярэнкі “White Night Blues”, і, адпаведна, творы больш яскрава выяўлялі сябе ў музычнай атмасферы. Як знак застылай музыкі ў адну кампазіцыю (чарговы раз) Марыя ўключыла сапраўдны саксафон.

Дарэчы, каб пераканацца, што творчы стыль Марыі Барысенкі надзвычай шырокі, і дапускае густоўнае і дарэчнае выкарыстанне прыёмаў традыцыйнага народнага ткацтва, варта завітаць на Някрасава, 3, дзе ў Цэнтры сучаснага мастацтва сёння яшчэ працягваецца выстава “7 + 2” — сямі мастачак ткацтва і двух аўтараў-керамістаў. Адна з удзельніц, як вы здагадаліся, Марыя Барысенка, экспануе там зусім адрозныя эстэтычна, але не менш цікавыя творы.

РЕПОЗИТОРИЙ



Матывуючы наведаць галерэю “Універсітэт культуры” на Кастрычніцкай пл., 1 перад 21 сакавіка — днём заканчэння выстаў, нагадаем чытачам, што Марыя Барысенка і Сяргей Аганаў ужо здабылі высокую — народную — ацэнку іх творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Марыя Барысенка . Сэрца кантрабаса (з серыі “JAZZ”)*

У 2014 годзе, цягам дэманстрацыі прывязанай да правядзення чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску вялізнай выставы “Avant-gARTe. Ад квадрата да аб’екта”, дзе дэманстраваліся сотні работ лепшых сучасных майстроў, Марыя і Сяргей трапілі ў спіс 10 лепшых — па выніках грамадскага апытання. Можа, не будзе залішнім нагадаць гэты спіс: Аляксандр Некрашэвіч, Канстанцін Селіханаў, Канстанцін Вашчанка, Таццяна Гомза, Марыя Барасенка, Сяргей Сотнікаў, Павел Вайніцкі, Кацярына Сумарава, Андрэй Шчукін і Сяргей Аганаў.

Запрашаем да больш дэталёвага знаёмства з творчасцю двух з 10 “абраных” на Кастрычніцкую пл., 1 (Палац Рэспублікі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ